Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт музычнага мастацтва

Кафедра мастацтва эстрады

УЗГОДНЕНА
В. а. заг. кафедры

______________Т.Н. Дробышава
«___»_________________2017 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

______________І.М. Грамовіч
«___»_________________2017 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# «ІМПРАВІЗАЦЫЯ НА СПЕЦІНСТРУМЕНЦЕ»
**(скрыпка, альт, віяланчэль)**

для спецыяльнасці
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
напрамак спецыяльнасці
*1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)*

Складальнік: *Белова М.В., дацэнт*

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета універсітэта 17.10.2017
пратакол № 2

Складальнік:

*Белова М.В.,* дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

Рэцэнзенты:

*Кафедра* струнна-смычковых інструментаў установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»;

*Міланіч А.Э.,* дацэнт кафедры тэорыі музыкі і музыкальнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства.

Разгледжан і рэкамендаван да зацвярджэння:

*Кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 12.09.2017 г.);
*Саветам* факультэта музычнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 25.09.2017 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА | 4 |
| 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 6 |
| 2.1 Змест аўдыторнай работы студэнтаў: тэарэтычная частка | 6 |
| 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 7 |
| 3.1 Змест аўдыторнай работы студэнтаў: практычная частка | 7 |
| 3.2 Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў | 8 |
| 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ | 9 |
| 4.1 Заданні для самастойнай кантраліруемай работы студэнтаў | 9 |
| 4.2 Рэпертуарныя праграмныя патрабаванні для студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі | 10 |
| 4.3 Рэпертуарныя праграмныя патрабаванні для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі | 11 |
| 4.4 Прыкладны спіс твораў для вывучэння | 12 |
| 4.5 Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці | 13 |
| 4.6 Крытэрыі адзнак вынікаў вучэбнай дзейнасці | 14 |
| 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ | 17 |
| 5.1 Тыпавая вучэбная праграма | 17 |
| 5.2 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны: дзённая форма атрымання адукацыі | 28 |
| 5.3 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны: завочая форма атрымання адукацыі | 29 |
| 5.4 Асноўная літаратура | 30 |
| 5.5 Дадатковая літаратура | 31 |


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Імправізацыя на спецінструменце» (скрыпка, альт, віяланчэль) прызначан для навукова-метадычнага забеспячэння працэса падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках), напрамак спецыяльнасці 1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка) у адпаведнасці с патрабаваннямі Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі, зацверджанным Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26.07.2011 №167.

Вучэбна-метадычны комплекс (ВМК) прызначаны дапамагчы выкладчыкам і студэнтам вышэйшых спецыялізаваных вучэбных устаноў у набыцці практычных навыкаў музычнай імправізацыі на струнна-смычковых інструментах.

Мэтай ВМК па дысцыпліне «Імправізацыя на спецінструменце» (скрыпка, альт, віяланчэль) з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў комплекснай сістэмы ведаў, ўменняў, навыкаў у сферы музычнай імправізацыі; падрыхтоўка да самастойнай, прафесійнай і музычна-асветніцкай дзейнасці; набыццё творчага вопыту, прадугледжаннымі вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі па напрамаках спецыяльнасці і патрабаванням адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь АСВА 1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады.

*Галоўнымі задачамі* ВМК з'яўляюцца:

– забеспячэнне павышэння якасці адукацыі у сферы эстраднага мастацтва

– вызначэнне дзідактычных сродкаў навучання для рэалізацыі адукацыйных задач, сфармуліраваных у тыпавой вучэбнай праграме па вучэбнай дысцыпліне «Імправізацыя на спецінструменце» (скрыпка, альт, віяланчэль)

– павышэнне прафесійнай кампетэнцыі і культурнага узроўня студэнтаў

– навукова-метадычнае суправаджэнне паслядоўнага засваення студэнтамі практычных навыкаў імправізацыі на інструменце.

Сістэма навучання выканальніцкаму майстэрству імправізацыі прадугледжвае практычныя заняткі з выкладчыкам а таксама самастойную работу студэнта. Прынцып асваення практычных навыкаў на аснове тэарэтычных ведаў дапамагае фарміраванню ў студэнтаў кампетэнцый, неабходных для вырашэння сучасных прафесійных задач.

Структурнымі элементамі ВМК з'яўляюцца вучэбна-праграмная, вучэбна-метадычная дакументацыя, інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы. *У тэарэтычным* раздзеле разгледжваюцца змест аўдыторнай работы са студэнтам, асноўныя паняцці музычнай імправізацыі на струнна-смычковых інструментах, складальнікі выканальніцкай імправізацыйнай тэхнікі, тэхнічныя сродкі навучання. Практычная частка аўдзіторнай работы са

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнтам, патрабаванні да музыканта-выканаўцы, метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойных заняткаў даны ў *практычным* раздзеле. Раздзел *кантролю ведаў* уключвае матэрыялы для назірання, ацэнкі, прагноза развіцця студэнта, заданні для самастойнай кантраліруемай работы, рэпертуарныя праграмныя патрабаванні, прыкладны спіс твораў для вывучэння, пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці. *Дапаможны* раздзел змяшчае тыпавую вучэбную праграму па вучэбнай дысцыпліне «Імправізацыя на спецінструменце» (скрыпка, альт, віяланчэль), вучэбна-метадычную карту вучэбнай дысцыпліны, спіс рэкамендаванай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Змест аўдзіторнай работы студэнтаў: тэарэтычная частка

Ва ўсім свеце ў апошні час назіраецца імклівае развіццё джазавага выканальніцтва на струнна-смычковых інструментах. Не гледзячы на тое, што традыцыі джазавага выканальніцтва на гэтых інструментах маюць даўнія і глыбокія карані, іх выканальніцкія магчымасці і знаходкі бударажаць уяўленне па гэты дзень.

Вучэбная дысцыпліна «Імправізацыя на спецінструменце» (скрыпка, альт, віяланчэль) арыентавана на дапамогу студэнту, якога цікавіць мастацтва джаза, крок за крокам авалодаць майстэрствам імправізацыі. Навучанне базіруецца на аснове праграмы, якая паслядоўна ставіць перад студэнтам усё больш цяжкія выканальніцкія задачы (захаванне дакладнага метрарытма, лёгкага раскладання джазавых акордаў, аналіза гарманічнай “сеткі”, прымянення верных штрыхоў, спецыфічнага гуказдабывання, дакладнага інтанавання і г.д.).

Неабходным элементам вучэбнага працэса з’яўляецца абавязковае азнаямленне з творчасцю і выкананнем вядучых замежных і айчынных джазавых музыкаў. Вывучэнне меладычнай мовы, манеры іх выканання, "з’ёма" на ноты яскравых імправізацый і іх аналіз, безумоўна таксама садзейнічаюць прафесійнаму росту студэнта.

Паслядоўнае навучанне, азнакамленне і вывучэнне мастацтва джаза мяркуе паралельнае праходжанне і набыццё ведаў у дысцыплінах: "Джазавае сальфеджыа", "Сучасныя стылі джазавай музыкі", "Джазавыя стандарты", "Гісторыя міравога і беларускага джаза", "Спецінструмент", "Аркестравы клас", "Інструментальны ансамбль".

Галоўнымі формамі аўдыторнай работы па дысцыпліне з'яўляюцца: аналіз (тэарэтычны аспект) і непасрэдна само выкананне твораў з імправізацыяй (практычная дзейнасць).

Развівая імправізацыйна-выканальніцкае, метадычнае мысленне студэнта, вывучая з ім разнастайны мастацкі і інструктыўны матэрыял, кіраўнік дысцыпліны садзейнічае таксама фарміраванню музыкі-выкладчыка.

Тэхнічнае забеспячэнне вучэбнай дысцыпліны “Імправізацыя на спецінструменце (скрыпка, альт, віяланчэль)” прадугледжвае наяўнасць у класе камп'ютарнага абсталявання з адпаведным ліцэнзіонным праграмным забеспячэннем. Ідэальнай умовай для якаснага навучання з'яўляецца наяўнасць гукаўзмацняльнай апаратуры і камплекта апаратуры для рытм-секцыі. Усё гэта даст магчымасць мець практыку музіцыравання ў складзе ансамбля.

Важнымі складальнікамі поспехаў у аўдыторнай рабоце студэнта з’яўляюцца стварэнне творчай атмасферы на занятках, імкненне да музычных эксперыментаў, добрае ўзаемаразуменне паміж выкладчыкам і студэнтам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Змест аўдзіторнай работы студэнтаў: практычная частка

Заняткі па дысцыпліне «Імправізацыя на спецінструменце» (скрыпка, альт, віяланчэль) праводзяцца індывідуальна з кожным студэнтам на аснове распрацаванай выкладчыкамі праграмы навучання і абавязковых семестравых патрабаванняў. Абавязковым кампанентам навучання таксама з'яўляецца індывідуальны план студэнта, які складаецца выкладчыкам на кожны семестр з улікам праграмных патрабаванняў, схільнасці студэнта, ступені яго адоранасці, музыкальнага развіцця, тэхнічнай падрыхтоўкі.

Практычная частка аўдзіторнай работы складаецца з праслухоўвання запісаў музыкі ў стылі джаз, падбора твораў для наступнай працы, аналіза абранага матэрыялу, з'ёма тэкста, яго разбора, вывучэння тэхналогіі ігры на інструменце, падрыхтоўка да канцэртнага выканання і, ў выніку, аналіза набытых выканальніцкіх навыкаў і прафесійнага ўзросту. Значнае месца ў аўдзіторнай рабоце адведзена пастановачнаму перыяду навучання, пастаноўке рук, корпуса будучага скрыпача, ці альціста, яго музыкальнай постаці.

Падбор вучэбнага матэрыяла ажыццяўляецца па прынцыпу ад простага да складанага. Для максімальна рэзультатыўнага навучання і выпрацоўкі індывідуальнага выканальніцкага стылю трэба ўключваць у праграму засваенне практыкаванняў па кожнай тэме і творы разнастайных джазавых стылявых напрамкаў. Таксама варта акцэнтаваць увагу студэнта на аналізе гармоніі, фактуры, вывучаемага твора, меладычных і гарманічных абаротаў.

Арганізацыя і методыка самастойных заняткаў па дысцыпліне ўяўляе адну з кардынальных праблем інструментальнай педагогікі. Практыка ўпэўнена даказвае , што рэзультатыўнасць метадаў навучання вызначаецца якасцю  самастойнай падрыхтоўкі, так як асноўная доля вучэбнага часу прыходзіцца на хатнія заняткі. Выкладчык павінен выхоўваць навыкі самастойнай работы ўвесь час накіроўвая і кантралюя заняткі студэнта. У час самастойных заняткаў здабываюцца навыкі выканальніцкай ініцыятывы і ў, выніку, артыстычнай індывідуальнасці.

Асноўным патрабаваннем сучаснага прагрэсіўнага навучання ігры на інструменце з'яўляецца прынцып адзінства мастацкага і тэхнічнага выхавання, пры вядучым значэнні мастацкага фактару.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.2 Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа – гэта адна з форм індывідуальнай дзейнасці студэнтаў, накіроўванная на ўзмацненне пройдзенага матэрыялу, фарміравання уменняў, навыкаў хутка рашаць пастаўленыя задачы, творча асэнсоўваць матэрыял. Самастойная работа прадугледжвае пошук, творчае засваенне і аналіз інфармацыі.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў абапіраецца на асноўныя формы:

– самастойныя заняткі на інструменце (выкананне гам, практыкаванняў, разбора тэкстаў, работа над мастацкім рэпертуарам);

– праслухоўванне аўдыязапісаў майстроў джазавай і папулярнай музыкі;

– аналіз творчасці і выканальніцкага стылю знакамітых выканаўцаў;

– аналіз музычных твораў;

– прагляд відэаматэрыялаў знакамітых выканаўцаў;

– наведванне канцэртаў, фестываляў, масцер-класаў джазавай, папулярнай музыкі.

Самастойныя заняткі на інструменце павінны мець заўсёды запланаваны і паслядоўны характар.

Вялікая роля ў час самастойных заняткаў адводзіцца такой форме работы як чытанне з ліста. Гэты навык дапамагае выпрацаваць у студэнта поўную прыгоднасць да прафесійнай дзейнасці ў любых умовах: ці то сольнае выкананне, ці то ансамблевае.

У працэсе работы над канкрэтнымі творамі неабходна адзначыць асноўныя творчыя і тэхнічныя задачы, спосабы іх вырашэння. Неабходна выпрацаваць пэўныя крытэрыі адзнакі тэхнічнага майстэрства выканаўцы і падпарадкаваць ім увесь навучальны працэс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні для самастойнай кантраліруемай работы студэнтаў

1. Выкананне папярэдняга інструктыўнага матэрыяла (гамы, арпеджыа, храматычныя паслядоўнасці);
2. Выкананне практыкаванняў, эцюдаў, капрысаў;
3. Вывучэнне джазавых стандартаў;
4. Азнаямленне з творчасцю, стылем, выканальніцкай тэхнікай выдатных джазавых музык;
5. З’ём твора з джазавай імправізацыяй і афармленне яго ў нотах;
6. Асэнсаванне выканальніцкіх цяжкасцей;
7. Работа з метраномам.

Узровень цяжкасці заданняў, іх паступовасць і паслядоўнасць кантралююцца выкладчыкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 Рэпертуарныя праграмныя патрабаванні для студэнтаў дзённай формы адукацыі

### I курс

1 семестр Практыкаванні
Два рознастылявых твора

2 семестр Практыкаванні
Два рознастылявых твора

### II курс

3 семестр Практыкаванні
Два творы ў розных стылях

4 семестр Практыкаванні
Два творы ў розных стылях

### III курс

5 семестр Практыкаванні
Два творы ў розных стылях

6 семестр Два творы ў розных стылях

### IV курс

7 семестр Два творы ў розных стылях

8 семестр Два творы ў розных стылях

## 4.3 Рэпертуарныя праграмныя патрабаванні для студэнтаў завочнай формы адукацыі

### I курс

1 семестр Практыкаванні
Два творы ў розных стылях

2 семестр Практыкаванні
Два творы ў розных стылях

### II курс

3 семестр Практыкаванні
Два творы ў розных стылях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 4 семестр | Практыкаванні<br>Два творы ў розных стылях |

**III курс**

| | |
|---|---|
| 5 семестр | Практыкаванні<br>Два творы ў розных стылях |
| 6 семестр | Практыкаванні<br>Два творы ў розных стылях |

**IV курс**

| | |
|---|---|
| 7 семестр | Два творы ў розных стылях |
| 8 семестр | Два творы ў розных стылях |

**V курс**

| | |
|---|---|
| 9 семестр | Два творы ў розных стылях |
| 10 семестр | Два творы ў розных стылях |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.4 Прыкладны спіс твораў для вывучэння

1. Барроу К. - Картер Р. «Жизнь Нью Йорка»
2. Бонфа Л. «Отзвуки карнавала»
3. Голощекин Д. «На солнечной стороне Невского»
4. Гарнер Э. «Misty»
5. Гарнер Э. «Salut Segovia»
6. Гершвин Дж. «Embraceable You»
7. Гершвин Дж. «Любимый мой»
8. Гершвин Дж. «Oh, Lady Be Good»
9. Граппелли С. «Вальс»
10. Граппелли С. «Все для тебя»
11. Граппелли С. «Дафна»
12. Граппелли С. «Касабланка»
13. Граппелли С. «Минорный свинг»
14. Граппелли С. «Я нашел новую малышку»
15. Джексон Милт «Тому, которого люблю»
16. Джимбел. Н. «Убей меня нежно»
17. Дидлей А. «Дейли»
18. Жобим А. К. «The Girl From Ipanema»
19. Жобим А. К. «Zazz in samba»
20. Камило М. «В огне»
21. Картер Р. «Леди, будь добра»
22. Картер Р. «Мохито»
23. Картер Р. «Самба»
24. Картер Р. «Софтли»
25. Картер Р. «Хочу тебе сказать»
26. Картер Р. «Что-нибудь для Грэйс»
27. Картер Р. «Я не могу поверить»
28. Керн Дж. «Ты для меня - все»
29. Колтрэйн Дж. «Blue Minor»
30. Кориа Ч. «Испания»
31. Кориа Ч. «Oblivion»
32. Кхан Ч. «Никто кроме тебя»
33. Лакатош Р. «Дорога для двоих»
34. Лакатош Р. «Мой приятель цыган»
35. Лакатош Р. «Послесловие»
36. Lakatos R. «Que Reste-Il De Nos Amours ? »
37. Локвуд Д. «Душа»
38. Локвуд Д. «Смелость любить»
39. Локвуд Д. «Я вспоминаю Элби»
40. Маико «Мерцающие огоньки»
41. Мейер Дж. «Сумасшедший ритм»
42. Миола Ан Ди «Средиземноморский солнечный танец»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

43. Паркер Ч. «Индиана Донна Ли»
44. Понти Ж.-Л. «2013 лет назад»
45. Понти Ж.-Л. «Космический океан»
46. Понти Ж.-Л. «Ностальгия»
47. Понти Ж.-Л. «Ритмы надежды»
48. Пьяццолла А. «Либертанго»
49. Пьяццолла А. «Oblivion»
50. Рейнхард Дж. «Свинг 48»
51. Рейнхард Дж. «Это ничего не значит»
52. Саус Э. «Пересмешник»
53. Смит С. «Калипсо»
54. Форе Г. – Картер Р. «Павана»
55. Харрис Э. «Послушай сейчас»
56. Эллингтон Д. «Это ничего не значит»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.5 Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Існуюць розныя формы дыягностыкі ведаў: залік, экзамен, акадэмічны канцэрт, справаздачны канцэрт кафедры, канцэрт класа выкладчыка кафедры, масцер-клас, адкрыты ўрок, тэматычны канцэрт, конкурсы, фестывалі, канцэрты ў рамках афіцыйных мерапрыемстваў.

Кантроль вучэбнай дзейнасці студэнтаў здзяйсняецца таксама пры дапамозе наступных форм дыягностыкі:

– практычныя індывідуальныя заняткі ў форме рэпетыцыі;
– абмеркаванне выканання, памылак і якасцей на занятках;
– асэнсаванне і абмеркаванне набытых навыкаў разнастайных прыёмаў ігры на інструменце, навыкаў расстаноўкі і прымянення аплікатуры і штрыхоў;
– з’ём і афармленне джазавай імправізацыі ў нотах;
– аналіз і абмеркаванне відыазапісаў залікаў, экзаменаў, ці выступленняў студэнта.

Адпаведна навучальнаму плану на дзённай форме адукацыі, залікі і экзамены праводзяцца ў 1 -8 семестрах. У 8 семестры ідзе падрыхтоўка канцэртнай праграмы і выкананне яе на Дзяржаўным экзамене. Тэхнічныя залікі праводзяцца ў 1, 3, 5 семестрах. Акадэмічныя канцэрты ў 2, 4, 6 семестрах. Срокі правядзення ўстанаўлівае кафедра.

На завочнай форме адукацыі залікі і экзамены праводзяцца ў 1 -10 семестрах. У 10 семестры таксама ідзе падрыхтоўка і выкананне канцэртнай праграмы на Дзяржаўным экзамене.

Студэнт мае магчымасць выступаць з адкрытымі сольнымі канцэртамі, якія па рашэнні кафедры залічваюцца як акадэмічны канцэрт, або экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.6 Крытэрыі адзнак вынікаў вучэбнай дзейнасці

*1(адзін)* Адмова ад выканання праграмы, адсутнасць прырашчэння ведаў і кампетэнтнасці ў рамках адукацыйнага стандарту.

*2(два)* Фрагментарныя веды; наяўнасць ў выкананні праграмы грубых і лагічных памылак; пасіўнасць на занятках, адсутнасць інтанавання; нізкі ўзровень культуры выканання музычных твораў.

*3(тры)* Нядосыць поўны аб'ём ведаў; выкананне музычных твораў з істотнымі і лагічнымі памылкамі; слабае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў, пасіўнасць на занятках, не дакладнае інтанаванне; нізкі ўзровень музычнай культуры выканання ігры на інструменце.

*4(чатыры)* Выкананне музычнай праграмы, без істотных памылак; валоданне агульнымі элементамі музычнага выканаўства на інструменце; не дакладнае валоданне тэхнічнымі прыёмамі, музыкальна-выканальніцкай тэхнікай ігры на інструменце; не стабільнае інтанаванне, дапушчальны ўзровень выканальніцкай культуры ігры на інструменце.

*5(пяць)* Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; валоданне агульнымі элементамі музычнага выканаўства; лагічнае мысленне музычнай формы; выкарыстоўванне шматлікіх тэхнічных сродкаў і прыёмаў; не дастатковая гнуткасць музычнага мыслення; не дакладнае гуказдабыванне, інтанаванне; добры ўзровень выканальніцкай музычнай культуры ігры на інструменце.

*6(шэсць)* Досыць поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; прысутнасць комплекса музычных здольнасцей (інтанаванне, дакладны рытм, штрыхі, гуказдабыванне, музычнае пачуццё); досыць свабоднае валоданне інструментам, музычнае мысленне, музыкальны густ.

*7(сем)* Наяўнасць комплекса музычных здольнасцей (стабільнае інтанаванне, дакладны рытм, штрыхі, гуказдабыванне, музычнае пачуццё); свабоднае валоданне музыкальна-выканальніцкай тэхнікай ігры на інструменце; засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры; высокі ўзровень музычнай культуры выканання праграмы.

*8(восем)* Вельмі дакладнае інтанаванне, адчуванне рытму, і г.д.); свабоднае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў; якаснае гуказдабыванне; здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры; актыўная самастойная праца і сістэматычны ўдзел ў розных канцэртных мерапрыемствах; высокі музычна-мастацкі густ выканання

*9(дзевяць)* Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ігры на інструменце; наяўнасць музычных здольнасцей (дасканалае інтанаванне, якаснае гуказдабыванне, артыкуляцыя штрыхоў, рытмічных узораў, баланс гучання, і г.д.); наяўнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мабілізацыі ўвагі, канцэнтрацыі творчых сіл, сваіх адносін да выканання, інтэрпрытацыі, адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ.

*10(дзесяць)* Бездакорнае выкананне праграмы; інтэрпрытацыя музычнага твора, адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ, дасканалае гуказдабыванне, асэнсаваны рытм, баланс гучання, дынаміка, тэмп; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры ў рамках вучэбнай праграмы; устойлівае інтанаванне; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы пры выкананні музычных твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Тыпавая вучэбная праграма

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІМПРАВІЗАЦЫЯ НА СПЕЦІНСТРУМЕНЦЕ
# (скрыпка, альт, віяланчэль)

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-01*
*Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)*

Мінск 2011

**Складальнік**

*М.В.Белова,* дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* мастацкай творчасці і прадзюсарства прыватнай установы адукацыі “Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокава”;
*Э.Б.Зарыцкі,* намеснік старшыні грамадскага аб’яднання “Беларускі саюз кампазітараў”

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 1 ад 29.08.2008 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 1 ад 28.09.2009 г.);
*навукова-метадычным* саветам па мастацтве музыкі Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 8 ад 24.12.2009 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В.В.Каташвілі*
Адказны за выпуск *М.В.Белова*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма “Імправізацыя на спецінструменце (скрыпка, альт, віяланчэль)” распрацавана для вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01 01 “Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)”.

Майстэрства імправізацыі характэрна для музыкі розных эпох і стыляў, у XX ст. яму было суджана адрадзіцца ў джазавай музыцы.

Дысцыпліна “Імправізацыя на спецінструменце (скрыпка, альт, віяланчэль)” адна з прафілюючых. Яна цесна ўзаемазвязана з такімі дысцыплінамі, як “Інструментазнаўства, аранжыроўка і пераклад музычных твораў”, “Спецінструмент”, “Інструментальны ансамбль”.

Вывучэнне імправізацыі на спецінструменце мае на мэце падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў да самастойнай дзейнасці, якія валодаюць ведамі ў сферы музычнай імправізацыі ў цэлым і імправізацыі на струнна-смычковых інструментах у прыватнасці.

Галоўнымі *задачамі* курса з’яўляюцца:

– развіццё творчай індывідуальнасці студэнтаў;

– набыццё навыкаў прафесійнага, свядомага, творча актыўнага выканання імправізацыі;

– уменне самастойна засвойваць матэрыял;

– пашырэнне музычнага кругагляду, выхаванне мастацкага густу;

– фарміраванне асабістага рэпертуару, рознахарактарнага па змесце, жанрах, стылях.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій выкладання курса “Імправізацыя на спецінструменце (скрыпка, альт, віяланчэль)” належыць выдзеліць: камунікатыўныя тэхналогіі (індывідуальныя заняткі, майстар-класы, канцэрты, конкурсы); метады аналізу выканальніцкіх задач, выпрацоўкі навыкаў самакантролю і самакарэкцыі; імітацыю і ўзнаўленне гукаінтанацыйнага паказу ва ўмовах камунікатыўнай сітуацыі.

Важнейшымі ўмовамі паспяховага засваення курса з’яўляюцца самастойная работа студэнтаў, творчае выкананне дамашніх заданняў. Усе практыкаванні павінны выконвацца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абавязкова ў 12 танальнасцях.

Выкладанне дысцыпліны “Імправізацыя на спецінструменце (скрыпка, альт, віяланчэль)” грунтуецца на непарыўнай сувязі тэорыі з практыкай.

Працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацтва эстрады накіраваны на авалоданне студэнтамі *ведамі і ўменнямі,* якія дазваляюць на высокім узроўні вырашаць прафесійныя задачы ў далейшай творчай і педагагічнай дзейнасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– асновы імправізацыі як від творчай дзейнасці музыканта;

– кампазіцыйныя прынцыпы імправізацыі;

– спецыфіку джазавай імправізацыйнай тэхнікі;

– ладава-інтанацыйную аснову джазавай імправізацыі;

– сучасныя метрарытмічныя мадэлі;

– прынцыпы нотнага запісу джазавай імправізацыі;

– літара-лічбавае абазначэнне акордаў.

Павінны *ўмець:*

– набываць самастойныя веды, вывучаючы кампазіцыйныя прынцыпы і спецыфіку тэхнікі джазавай імправізацыі вядомых музыкантаў свету;

– выкарыстоўваць джазавую ладава-інтанацыйную аснову і сучасныя метрарытмічныя мадэлі пры стварэнні імправізацыі;

– карыстацца нотным запісам джазавай імправізацыі;

– расшыфроўваць літара-лічбавае абазначэнне акордаў і імправізаваць на яго падставе;

– ужываць мікрафон, гуказдымальнік і электраэфекты падчас імправізацыі.

Агульная колькасць гадзін па дысцыпліне “Імправізацыя на спецінструменце (скрыпка, альт, віяланчэль)” складае 350 (з якіх 150 гадзін адведзены на аўдыторныя (індывідуальныя) заняткі. Веды і практычныя навыкі студэнтаў кантралююцца ў працэсе навучання (залікі, экзамены).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін (індывідуальныя заняткі) |
|---|---|
| ***Тэма 1.*** Пастаноўка тэхнічнага апарату музыканта, яе варыянты | 2 |
| ***Тэма 2.*** Аплікатура: мадэлі і выразныя магчымасці ў джазавай музыцы | 15 |
| ***Тэма 3.*** Гуказдабыванне, прыёмы глісанда, прыёмы смычковай і пальцавай вібрацыі ў розных стылях джазавай музыкі | 15 |
| ***Тэма 4.*** Прынцыпы інтанавання джазавай музыкі на струнных інструментах | 8 |
| ***Тэма 5.*** Штрыхавыя асаблівасці выканання джазавай музыкі | 8 |
| ***Тэма 6.*** Асаблівасці выканання музычнай імправізацыі з мікрафонам, гуказдымальнікам. Электрычныя эфекты | 10 |
| ***Тэма 7.*** Матыў, фраза, форма імправізацыі (джазавы квадрат) | 10 |
| ***Тэма 8.*** Гамападобныя рухі, арпеджыа | 8 |
| ***Тэма 9.*** Джазавы акорд і гарманічныя схемы музычнага твора ў розных спалучэннях і варыянтах | 15 |
| ***Тэма 10.*** Літара-лічбавае абазначэнне акордаў | 6 |
| ***Тэма 11.*** Ладавая аснова джазавай імправізацыі | 10 |
| ***Тэма 12.*** Асновы рытму. Сучасныя рытмічныя мадэлі | 16 |
| ***Тэма 13.*** Блюз. Асаблівасці музычнай імправізацыі ў стылі блюз | 12 |
| ***Тэма 14.*** Прынцыпы фарміравання навыкаў імправізацыі ў класе струнна-смычковых інструментаў | 15 |
| **Усяго…** | **150** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## *Тэма 1. Пастаноўка тэхнічнага апарату музыканта, яе варыянты*

Патрабаванні да пастаноўкі апарату музыканта: максімальная фізічная свабода, хуткасць рэакцыі, фізіялагічны камфорт, зручнасць, што дазваляе выкарыстоўваць шматлікія тэхнічныя сродкі і прыёмы і забяспечвае неабмежаваныя тэхнічныя магчымасці выканаўцы. Варыянты пастаноўкі левай рукі. Ігра смыком: універсальнасць валодання, размеркаванне смыка ў залежнасці ад мастацкай задумы выканаўцы. Піцыката. Варыянты выканання.

## *Тэма 2. Аплікатура: мадэлі і выразныя магчымасці ў джазавай музыцы*

Абсалютнае веданне грыфа, навыкі міжпазіцыйнай ігры. Свабоднае арыентаванне ва ўсіх танальнасцях у храматычнай паслядоўнасці. Адпаведнасць пастаноўкі кожнага пальца пэўнай ноце. Выпрацоўка рэфлексорнага ўспрымання гуку. Універсальнае размяшчэнне пальцаў на грыфе, што дазваляе без папярэдняй падрыхтоўкі выконваць максімальна магчымую колькасць гукаў. Аплікатурнае бачанне меладычнага матэрыялу. Развіццё навыкаў успрымання музычнай думкі як пэўнай камбінацыі пальцаў. Мысленне аплікатурнымі стандартамі, трэнінг на аўтаматызм выканання аплікатурных мадэлей.

## *Тэма 3. Гуказдабыванне, прыёмы глісанда, прыёмы смычковай і пальцавай вібрацыі ў розных стылях джазавай музыкі*

Стылі кантры, рытм-энд-блюз: асаблівасці гуказдабывання – шчыльны гук з выражанай атакай, часцей без вібрацыі. Стылі класічнага джаза і свінг: лёгкае гучанне з хуткімі спадамі і пад'ёмамі сілы гуку на адной ноце, наяўнасць глісанда і выражанай вібрацыі. Рытмаформула стылю свінг. Тэхніка свінгавання. Стылі сучаснага джаза: бі-боп, джаз-рок, фьюжн і інш. Адсутнасць вібрацыі і глісанда, наяўнасць роўнай сілы гуку. Джазавая вібрацыя – павольная і абавязкова кратная метру. Смычковая і пальцавая вібрацыя: асаблівасці выканання. Прыёмы выканання розных відаў глісанда.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4. Прынцыпы інтанавання джазавай музыкі на струнных інструментах*

Інтанаванне на струнна-смычковым інструменце як магчымасць пастаяннага пошуку і самавыяўлення ў джазе. Лабільнае інтанаванне і развіццё інтанацыйнага слыху. Інтанаванне і пэўны выканальніцкі прыём. Залежнасць прыгажосці гуку, тэмбру інструмента ад дакладнага інтанавання. Джазавае інтанаванне як вяршыня меладычнай выразнасці ў джазавай музыцы. Інтанаванне ў кантэксце шэрагу мастацкіх эфектаў. Выкарыстанне інтанацыйных эфектаў для агучвання дынамічных ліній, для гарманічнай выразнасці.

### *Тэма 5. Штрыхавыя асаблівасці выканання джазавай музыкі*

Паняцце “штрых”. Штрыхі джазавай музыкі. Абазначэнне штрыхоў у нотах. Штрых і выразныя магчымасці музыкі. Штрых як характэрная рыса стылю. Музычныя стылі джаза і спецыфіка выкарыстання штрыхоў. Штрыхі стылю свінг. Спецыфіка выканання пункцірных штрыхоў.

### *Тэма 6. Асаблівасці выканання музычнай імправізацыі з мікрафонам, гуказдымальнікам. Электрычныя эфекты*

Імправізацыя з мікрафонам: спосабы захавання інструментальнага тэмбру з мэтай максімальна пазбегнуць непажаданых прыгукаў. Галоўныя прынцыпы работы з мікрафонам. Выкананне музычнага твора з гуказдымальнікам. Месца і спосаб мацавання гуказдымальніка да дэкі. Спосабы гуказдабывання: мяккая пальцавая ігра левай рукі, мяккае вядзенне смыком. Электрычныя эфекты: аб'ёмнасць гучання, рэверберацыя. Асаблівасці іх выкарыстання ў музыцы.

### *Тэма 7. Матыў, фраза, форма імправізацыі (джазавы квадрат)*

Матыў – самастойная формаўтваральная і найменшая адзінка, якая складае імправізацыю. Меладычнае, рытмічнае развіццё матыву. Навык выкарыстання матываў, іх вар’іраванне для стварэння разнастайных імправізацый. Злучэнне матываў – аснова пабудовы музычнай фразы. Варыянты пабудовы музычнай фразы. Вызначэнне формы імправізацыі адпаведна мастацкім задачам, пастаўленым выканаўцам. Варыянты пабудовы імправізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Джазавы квадрат як галоўная кампазіцыйная і гарманічная адзінка імправізацыі.

### *Тэма 8. Гамападобныя рухі, арпеджыа*

Мелодыя ў джазе. Спецыфічнасць манеры меладычнага гуказдабывання: атака гуку, акцэнтаванне долей, артыкуляцыя. Мелодыя і розныя стылявыя напрамкі джаза. Выкананне мелодыі ў стылі свінг. Выкарыстанне ў імправізацыйных лініях гамападобных канструкцый. Стварэнне гамападобнага малюнка мелодыі. Методыка засваення розных відаў пасажаў. Праходзячыя і дапаможныя ноты. Апяванні. Арпеджыа: кароткія, доўгія, ломаныя. Спецыфіка выканання ў меладычнай лініі музычнага твора. Выпрацоўка навыку выканання арпеджыа па квінтавым крузе, дыятоніцы, храматыцы.

### *Тэма 9. Джазавы акорд і гарманічныя схемы музычнага твора ў розных спалучэннях і варыянтах*

Джазавая імправізацыя на струнна-смычковым інструменце. Паслядоўнасць гарманічных акордаў (джазавы квадрат, ці гарманічная схема музычнага твора) як умова выканання джазавай імправізацыі на інструменце. Гарманічная паслядоўнасць ва ўзаемасувязі з іншымі сродкамі выразнасці ў музыцы. Акордавыя паслядоўнасці. Будова і абазначэнне джазавых акордаў. Пяць відаў сэптакордаў. Альтэрацыя гукаў. Нонакорд. Надбудовы сэптакордаў і альтэрацыя ступеней.

### *Тэма 10. Літара-лічбавае абазначэнне акордаў*

Літары, лічбы і знакі ў літара-лічбавым абазначэнні акордаў. Спосабы выкарыстання літар (лацініца, кірыліца); рымскіх і арабскіх лічбаў; знакаў “+”, “-” у джазавай музыцы.

### *Тэма 11. Ладавая аснова джазавай іправізацыі*

Лад як элемент імправізацыі. Лады народнай музыкі: лідзійскі, эалійскі, міксалідыйскі, дарыйскі, фрыгійскі, іанійскі і інш. Лады і храматызматыка. Лады і будова меладычных фігурацый. Лады і стылявыя напрамкі джазавай музыкі: новаарлеанскі стыль, свінг, бі-боп і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 12. Асновы рытму. Сучасныя рытмічныя мадэлі*

Рытм як галоўны элемент джазавай імправізацыі. Свінг як асабістае пачуццё рытму. Свінгавая пульсацыя. "Блукаючы бас" і "блукаючы акцэнт". Рытмаванае вар'іраванне ў працэсе выканання стылю свінг. Артыкуляцыя. Метрарытмічныя суадносіны мелодыі і біта. "Off-bit".

### *Тэма 13. Блюз. Асаблівасці музычнай імправізацыі ў стылі блюз*

Блюз і мінорная пентатоніка. Блюзавы гукарад, блюзавыя тоны ("брудныя" (dirty tones) III, V, VII ступені), блюзавая гама: асаблівасці выканання. Лабільнае інтанаванне як элемент музычнай выразнасці блюза. Імправізацыя ў розных музычных формах блюза: 8-тактавая, 12-тактавая (класічная), 16-тактавая. Стылявыя прыёмы выканання блюза. Блюзавыя стандарты.

### *Тэма 14. Прынцыпы фарміравання навыкаў імправізацыі ў класе струнна-смычковых інструментаў*

Разуменне і стварэнне імправізацыі на струнна-смычковым інструменце як спалучэнне гарманічна прадуманага, спланаванага дзеяння музыканта з імгненным музычным вобразам, творчасцю. Навыкі імправізацыі ў навучанні: пэўная свабода меладычнага малюнка, сінкапіраваная акцэнтуацыя, ірваны рытм, жорсткі гарманічны квадрат. Ігра з акампанементам або магнітафонам. Вывучэнне і аналіз імправізацый замежных і айчынных джазавых музыкантаў. Падрабязнае вывучэнне іх манеры выканання, гарманічнай, рытмічнай, меладычнай мовы. Стварэнне на гэтай падставе індывідуальнага выканальніцкага стылю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Браславский, Д.В.* Аранжировка для эстрадных ансамблей и оркестров / Д.Б.Браславский. – М.: Музыка, 1974. – 324 с.

2. *Бриль, И.* Практический курс джазовой импровизации / И.Бриль. – М.: Сов. композитор, 1982. – 111 с.

3. *Гаранян, Г.* Аранжировка для эстрадных инструментальных и вокально-инструментальных ансамблей / Г.Гаранян. – М.: Музыка, 1983. – 238 с.

4. *Горват, И.*Основы джазовой интерпретации / И.Горват, И.Васерберг. – Киев: Муз. Україна, 1980.–120 с.

5. *Есаков, Е.* Основы джазовой импровизации / М.Есаков. – М.: Музыка, 1994. – 56 с.

6. *Конен, В.Д.* Рождение джаза / В.Д.Конен. – М.: Сов. композитор, 1984. – 311 с.

7. *Кунин, Э.* Секреты ритмики в джазе, рок и поп-музыке / Э.И.Кунин. – М., 1997. – 40 с.

8. *Кунин, Э.И.* Скрипач в джазе / Э.И.Кунин – М.: Сов. композитор, 1988. – 78 с.

9. *Мальцев, С.* О психологии музыкальной импровизации / С.Мальцев. – М.: Музыка, 1991. – 110 с.

10. *Романенко, В.В.* Учись импровизировать / В.В.Романенко. – М.: Музыка, 2003. – 79 с.

11. *Симоненко, В.С.* Лексикон джаза / В.С.Симоненко. – Киев: Муз. Україна, 1981. – 215 с.

12. *Симоненко, В.С.* Мелодии джаза / В.С.Симоненко. – 4-е изд. – Киев: Муз. Україна, 1984. – 347 с.

13. *Чак Шер.* Импровизация на бас-гитаре и контрабасе / Чак Шер. – М.: Guitar College, 1997. – 127 с.

14. *Чугунов, Ю.М.* Гармония в джазе / Ю.М.Чугунов. – М.: Сов. композитор, 1988. – 152 с.

*Дадатковая*

1. *Коллиер, Дж.Л.* Становление джаза / Дж.Л.Коллиер. – М.: Радуга, 1984. – 389 с.

2. *Молотков, В.* Джазовая импровизация на инструментальной гитаре / В.Молотков. – Киев: Муз. Україна, 1983. – 147 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ІМПРАВІЗАЦЫЯ НА СПЕЦІНСТРУМЕНЦЕ**
**(скрыпка, альт, віяланчэль)**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01- 01*
*Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)*

Рэдактар В.В.Каташвілі
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60х84 $^1/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. 0,39.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны: дзённая форма атрымання адукацыі

| Разделы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | індывідуальныя заняткі | КСР | |
| Уводзіны ў дысцыпліну | 1 | 1 | | |
| **Раздзел I. Спецыфіка джазавай выканальніцкай тэхнікі на струнна-смычковых інструментах** | | | | |
| *Тэма 1.* Пастаноўка іграваога апарата | 5 | 5 | | |
| *Тэма 2.* Аплікатура: мадэлі і выразныя магчымасці ў джазавай музыцы | 5 | 5 | | Кантрольны ўрок |
| *Тэма 3.* Гуказдабыванне, прыёмы глісанда, прыёмы смычковай і пальцавай вібрацыі ў розных стылях джазавай музыкі | 23 | 15 | 8 | Акадэмічны канцэрт |
| *Тэма 4.* Штрыхавыя асаблівасці выканання джазавай музыкі | 17 | 15 | 2 | Кантрольны ўрок |
| *Тэма 5.* Асаблівасці выканання музычнай імправізацыіі з мікрафонам, гуказдымальнікам. | 3 | 3 | | |
| **Раздзел II. Складаючыя джазавай імправізацыі** | | | | |
| *Тэма 6.* Матыў, фраза, форма імправізацыі (джазавы квадрат) | 30 | 20 | 10 | |
| *Тэма 7.* Гамападобныя рухі, арпеджыа | 7 | 7 | | |
| *Тэма 8.* Джазавы акорд і гарманічныя схемы музычнага твора ў розных спалучэннях і варыянтах | 7 | 7 | | |
| **Раздзел III. Літара-лічбавае абазначэнне акордаў** | 12 | 10 | **2** | |
| **Раздзел IV. Асновы рытму. Сучасныя рытмічныя мадэлі** | 30 | 25 | **5** | |
| **Раздзел V. Прынцыпы фарміравання навыкаў імправізацыі ў класе струнна-смычковых інструментаў** | 20 | 15 | **5** | |
| **Усяго…** | **160** | **128** | **32** | **Залік, экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.3 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны: завочная форма атрымання адукацыі

| Разделы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|
| | усяго | індывідуальныя заняткі | |
| Уводзіны ў дысцыпліну | 1 | 1 | |
| **Раздзел I. Спецыфіка джазавай выканальніцкай тэхнікі на струнна-смычковых інструментах** | | | |
| *Тэма 1.* Пастаноўка іграваога апарата | 5 | 2 | |
| *Тэма 2.* Аплікатура: мадэлі і выразныя магчымасці ў джазавай музыцы | 5 | 3 | |
| *Тэма 3.* Гуказдабыванне, прыёмы глісанда, прыёмы смычковай і пальцавай вібрацыі ў розных стылях джазавай музыкі | 23 | 5 | |
| *Тэма 4.* Штрыхавыя асаблівасці выканання джазавай музыкі | 17 | 3 | |
| *Тэма 5.* Асаблівасці выканання музычнай імправізацыіі з мікрафонам, гуказдымальнікам. | 3 | 2 | |
| **Раздзел II. Складаючыя джазавай імправізацыі** | | | |
| *Тэма 6.* Матыў, фраза, форма імправізацыі (джазавы квадрат) | 30 | 5 | |
| *Тэма 7.* Гамападобныя рухі, арпеджыа | 7 | 4 | |
| *Тэма 8.* Джазавы акорд і гарманічныя схемы музычнага твора ў розных спалучэннях і варыянтах | 7 | 5 | |
| **Раздзел III. Літара-лічбавае абазначэнне акордаў** | 12 | 2 | |
| **Раздзел IV. Асновы рытму. Сучасныя рытмічныя мадэлі** | 30 | 4 | |
| **Раздзел V. Прынцыпы фарміравання навыкаў імправізацыі ў класе струнна-смычковых інструментаў** | 20 | 4 | |
| **Усяго…** | **160** | **40** | **Залік, экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4 Асноўная літаратура


1. *Браславский, Д.В.* Аранжировка для эстрадных ансамблей и оркестров / *Д.Б. Браславский* – М. : Музыка, 1974. – 324 с.

2. *Брилъ, И.* Практический курс джазовой импровизации / И. Бриль – М. : Советский композитор, 1982. – 111 с.

3. *Гаранян, Г.* Аранжировка для эстрадных инструментальных и вокально-инструментальных ансамблей / Г. Гаранян – М. : Музыка, 1983. – 238 с.

4. *Горват, И*. Основы джазовой интерпретации / И. Говат, И. Васерберг – Киев : Муз. Украина, 1980.–120 с.

5. *Есаков, Е.* Основы джазовой импровизации / М. Есаков – М. :Музыка,1994. – 56 с.

6. *Конен, В.Д.* Рождение джаза / В.Д. Конен – М. : Советский композитор, 1984. – 311 с.

7. *Кунин, Э.* Секреты ритмики в джазе, рок и поп-музыке / Э.И. Кунин – М., 1997. – 40 с.

8. *Кунин, Э.И.* Скрипач в джазе / Э.И. Кунин – М. : Советский композитор, 1988. – 78 с.

9. *Мальцев, С.* О психологии музыкальной импровизации / С. Мальцев – М. : Музыка, 1991. – 110 с.

10. *Романенко, В.В.* Учись импровизировать / В.В. Романенко – М. : Музыка, 2003. – 79 с.

11. *Симоненко, В.С.* Лексикон джаза / В.С. Симоненко – Киев : Музічна Украіна, 1981. – 215 с.

12. *Симоненко, В.С.* Мелодии джаза. – 4-е изд. / В.С. Симоненко – Киев : Музічна Украіна, 1984. – 347 с.

13. *Чак Шер* Импровизация на бас-гитаре и контрабасе / *Чак Шер* – М. : Guitar College, 1997. – 127 с.

14. *Чугунов, Ю.М.* Гармония в джазе / Ю.М. Чугунов – М. : Советский композитор, 1988. – 152 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.5 Дадатковая літаратура


1. *Коллиер, Дж.Л.* Становление джаза / Дж.Л. Коллиер – М.: Радуга, 1984.- 389 с.

2. *Молотков, В.* Джазовая импровизация на инструментальной гитаре / В. Молотков – Киев : Музічна Украіна, 1983. – 147 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ